View metadata, citation and similar papers at core.ac.uk
brought to you by CORE
provided by BSU Digital Library

**Павел Навойчык,**
*БДУ, Мінск*

# ЯКУБ КОЛАС І ЎКРАІНСКАЯ ЛІТАРАТУРА

Узаемасувязі Якуба Коласа з украінскай літаратурай даўнія, глыбокія і надзвычай markup розна бакoвыя.

Пераклады вершаў Якуба Коласа на ўкраінскую мову ўпершыню былі зроблены яшчэ ў нашаніўскі перыяд – верш “Вярба” (Вербина) у перакладзе М. Шапавала быў надрукаваны ў газеце “Слово” 8 сакавіка 1909 года, а 2 лютага 1910 у газеце “Рада” ў перакладзе некага П. Г. – верш “Нёман” (Немань). У нашаніўскі перыяд адбылося знаёмства ўкраінскага чытача і з празаічнымі творамі Коласа – казка “Дудар” у перакладзе Б. Заклынскага была надрукавана ў газеце “Неділя” 26 мая 1912 года. У гэты ж перыяд ва ўкраінскім перыядычным друку было апублікавана яшчэ некалькі вершаў беларускага паэта. У гады першай сусветнай і грамадзянскай войнаў да перакладаў твораў Коласа ўкраінскія пісьменнікі не звярталіся. Яно і зразумела, сацыяльная праблематыка мірнага жыцця страціла сваю вастрыню, на парадку дня стаялі іншыя праблемы.

У 20 – 30-я гады XX ст. пераклады твораў Якуба Коласа на ўкраінскую мову з’яўляюцца нячаста: у 1921 і 1922, 1929, 1937 – 1939 гадах. Прычым у 1921 і 1922 гадах былі публікацыі не ў савецкім друку, а ў эміграцкім: Спогади любі з далекого, рідного краю: [Верш] / Пер. О. Яремченко // Воля (Відень). 1921. 26 лют.; Поле великеє, поле пісчанеє!: [Верш] // Свобода (Джерзи Сіти). 1922. 22 січ. Відавочна ўкраінскім эмігрантам былі блізкімі па настрою настальгічныя матывы лірыкі беларускага паэта.

Творы Якуба Коласа, апублікаваныя ва ўкраінскай перыёдыцы ў 1929 годзе, закранaлі самую розную тэматыку – пейзажная лірыка, грамадзянская і інш., а вось ужо ў канцы 1930-х друкаваліся выключна тэндэнцыйныя вершы, скіраваныя на ўслаўленне партыі і партыйных дзеячаў Савецкага Саюза, а таксама шчаслівага жыцця савецкага народа пад “мудрым кіраўніцтвам камуністычнай партыі бальшавікоў”: Народам СРСР: [Верш] // Комуніст. 1938. 27 трав.; XVIII з'їздові партії: [Верш] / Пер. Т.Масенко // Літ. журнал. 1939.

№4; Батьківщині і вождю: (З віршів і пісень про Сталін. Конституцію) / Саавут. Я.Купала, А.Александровіч і інш.; Великому обранцю білорус, народу: [Верш] / Більшовик. 1938. 9 черв.

У ваенныя гады новых перакладаў альбо не было, альбо яны не друкаваліся. Толькі ў 1946 годзе з'явілася некалькі вершаў ваеннай пары: Бійцям і командирам Червоноі Арміі; Суд у лісі: [Вершы] / Пер. М.Терещенко / / Літ. газ. 1946. 2 лист. Затое ў пасляваенны перыяд пераклады вершаў, прозы і драматургіі Коласа друкуюцца амаль кожны год да самай смерці паэта, а пасля яго смерці – раз у два-тры гады аж да распаду Савецкага Саюза. Аднак характэрна, што гэта ўсё не пераклады новых твораў і нават далёка не самае лепшае з паэтычнай спадчыны паэта. У сталінскі перыяд друкавалася найперш ідэалагічна выверaная паэзія: У залі Кремлівського палацу / Пер. П. Тичина; Наш шлях / Пер. М. Зісман: [Вершы] // Вітчизна. 1947. № 7; Живе між нас геній: [Вершы] / Пер. Г. Биченюк // Дніпро. 1947. № 3; Під сталінським сонцем: [Верш] // Рад. селянин. 1947. 31 жовт.; Перший кандидат: [Верш] // Рад. Укр. 1947. 9 лют. і інш.

Творы іншай тэматычнай скіраванасці (хаця яны па-ранейшаму суседнічалі з вершамі пра партыю і яе правадыроў) пачалі друкавацца ўжо ў 1960 – 1970-я гады: Доля наймички / Пер. В.Сидоренко; Живе з нами Ленін / Пер. В.Мордань; Ленінським шляхом / Пер. С.Реп'ях; Солдату; До весни; Загадка / Пер. А.Таран; Весна / Пер. С.Йовенко; На лузі / Пер. М.Сом; У полі; Струмок; На річці / Пер. Д.Шутти; Зима / Пер. Г.Демченко: [Вершы] // Лісова колиска. К., 1979; До весни; Сам собі; На полі весною; "Скоро в полі забуяє…"; Ліс: [Вершы] / Пер. І.Кулик // Зоря. 1982. 3 лист.

Доўгі час украінскі чытач мог ведаць Коласа пераважна як паэта-лірыка і апавядальніка – майстра малых форм. З буйных твораў у даваенны час пабачыў свет толькі пераклад "Дрыгвы" (Трясовина: [Аповесць] / Пер. М. Полотай // Рад. літ. 1937. № 8). Пераклады іншых аповесцяў і драм пачалі з'яўляцца ў другой палове 1950-х гадоў – гэта драма "Вайна – вайне" (Війна – війні: Драма / Пер. Г. Вігурська. К., 1956), таксама была перавыдадзена аповесць "Дрыгва" (на гэты раз пад назваю "Дід Талаш" / Пер. М. Полатай. К., 1958), і нарэшце ўбачыў свет украінскі варыянт трылогіі "На ростанях" (На розстанях: Трилогія / Пер. Г. Вігурська. К., 1958). У наступныя гады трылогія перавыдавалася яшчэ двойчы – у 1970 і 1982 гадах.

А вось поўнага перакладу на ўкраінскую мову паэмы "Новая зямля" – аднаго з самых значных не толькі ў творчай спадчыне класіка, але і ва ўсёй беларускай літаратуры ўзору паэтычнага эпасу – у XX стагоддзі так і не з'явілася. Былі надрукаваны толькі паасобныя раздзелы: З поеми "Нова земля" / Пер. С. Пилипенко // Нова Білорусь. К., 1929; Лісникова садиба; "А на подвір'ї поруч з садом…"; "Мій

рідний закут, луг, криниця!..”: [Урыўкі з паэмы “Новая зямля”] / Пер. С.Пінчук // Молода гвардія. 1982. 10 груд. Пераклад жа ўсяго тэксту пабачыў свет толькі ў XXI ст.: Нова земля: поема / Якуб Колас: переклад з білоруської Валерія Стрілка. – Київ : Український письменник, 2006. Чаму пераклад усёй паэмы не з’явіўся раней, калі дэманстрацыя дружбы народаў была важнай складаючай нацыянальнай палітыкі Савецкага Саюза, а таксама наколькі ўдалым аказаўся пераклад В. Стрілка – гэтыя і іншыя пытанні яшчэ чакаюць свайго даследчыка.

Талент паэта прыцягнуў увагу ў братняй Украіне не толькі паэтаў-перакладчыкаў, але і даследчыкаў літаратуры, літаратурных крытыкаў яшчэ ў нашаніўскі перыяд. Так, пасля выхаду з друку першага зборніка вершаў Якуба Коласа “Песні жальбы” рэцэнзіі на кнігу на працягу 1910 – 1911 гадоў выйшлі ў пяці ўкраінскіх выданнях: Песні-жальбы. Вільня, 1910. Рэц.: Гай П. // Рада. 1910. 21 жовт.; Гермайзе О. Якуб Колас: Песні жальбы // Укр. хата. 1911. № 1; Евшан М. [Федюшка М.] Якуб Колас: Песні жальбы // Літ.-наук. вісник (Львоў). 1911. № 1; Свобода (Нью-Йорк). 1911. 26 січ.; Щурат В. // Неділя. 1911. 1 січ. Такой увагай да дэбютнага зборніка мала хто мог пахваліцца і ў самой Украіне! А яшчэ раней станоўчая ацэнка творчасці Коласа прагучала ў артыкуле Дарашэнкі Д. “Білоруси і їх національне відродження” (Рада. 1908. 31 кастр.).

Ці выявіў беларускі паэт такую ж цікавасць да братняй літаратуры на пачатку свайго творчага шляху? Адназначнага адказу на гэтае пытанне няма. Сапраўды, на сённяшні дзень мы не ведаем коласаўскіх перакладаў, зробленых раней 1926 года. Аднак жа агульнавядомая ідэйна-тэматычная, вобразная блізкасць лірыкі Тараса Шаўчэнкі і Якуба Коласа (да прыкладу, гл. Шаўчэнка і беларуская паэзія // Тарас Шаўчэнка і беларуская літаратура. Мн., 1964). Творы ўкраінскіх аўтараў рэгулярна з’ўляліся на старонках “Нашай нівы” і Колас безумоўна чытаў і ведаў іх. Іншая рэч, што жыццёвыя абставіны маладога паэта складваліся ў той час мякка кажучы не вельмі спрыяльна для творчай працы. Пісаць у турэмнай няволі арыгінальныя творы яшчэ неяк удавалася, а вось заняцца перакладамі не было ніякай магчымасці. Пазней гады ваеннага ліхалецця таксама не спрыялі звароту да перакладаў. Толькі ў 1920-я можна было без перашкод брацца за перастварэнне іншанацыянальных твораў на родную мову. І сапраўды, першыя пераклады з іншых моў зроблены Коласам у 1926 годзе. Праўда, пачыналася перакладчыцкая дзейнасць паэта не з украінскай літаратуры. Як слушна заўважыў В. Рагойша, некалькі твораў Рабіндраната Тагора, перакладзеныя не з арыгінала, а праз мову-пасрэднік, “з'явіліся для пісьменніка своеасаблівай пераходнай ступенню да яго пазнейшых перакладаў. І не толькі ў

сэнсе павышэння перакладчыцкага майстэрства. Пераклады з Р. Тагора – гэта адзіны, выключны выпадак, калі Колас перакладаў не непасрэдна з мовы арыгінала, якую ён не ведаў, але праз пасрэдніцтва рускай мовы.” [1, с. 20].

Па шэрагу прычын найбольш спрыяльным часам для працы над перакладамі сталі 1930-я гады. З аднаго боку, жорсткія сталінскія рэпрэсіі, пераслед нацыянальнай інтэлігенцыі, абвінавачванні пісьменнікаў у варожым стаўленні да савецкай улады, у неадпаведнасці мастацкіх твораў ідэалогіі камуністычнай партыі, а значыць і запатрабаванням шырокіх народных мас, фактычна звялі на нішто любыя спробы мастацкага пошуку, творчага эксперыменту, філасофскага роздуму ў арыгінальнай творчасці. З другога боку, устаноўка кіраўніцтва краіны на дэманстрацыю адзінства народаў Савецкага Саюза, правядзенне рэгулярных Дзён культуры адной рэспублікі ў другой, гучнае святкаванне юбілеяў класікаў літаратуры, культуры – усё гэта якраз і заахвочвала пісьменнікаў да перакладчыцкай дзейнасці.

Пераклады з іншанацыянальных літаратур дазвалялі ў пэўнай ступені кампенсаваць застой, які назіраўся ў літаратурным жыцці народаў Савецкага Саюза. Больш таго, часам перакладныя творы, напісаныя ў дарэвалюцыйны час, аказваліся надзвычай сучаснымі для драматычных рэалій 1930-х гадоў! Так, калі ў 1939 г. святкаваўся 135-гадовы юбілей Тараса Шаўчэнкі, у Беларусі было прынята рашэнне выдаць “Кабзар” на беларускай мове. Рэдагаваў зборнік, разам з Янкам Купалам, Якуб Колас. Вершы, паэмы, якія меркавалася ўключыць у кнігу, былі раздадзены для перакладу найбольш таленавітым беларускім паэтам. Колас таксама пераклаў для гэтага выдання 17 вершаў і паэм, у ліку якіх “Ерэтык”, “Неафіты” і інш. Вершы, паэмы, у якіх крытыкаваўся дзяржаўны лад, нацыянальная палітыка царскай Расіі часоў Мікалая І і нават падзеі, што адбываліся ў старажытным Рыме, былі парадаксальна блізкімі і зразумелымі чытачам зусім іншай эпохі. Звернем увагу хаця б на гэтыя радкі з паэмы “Неафіты”:

…Твой
Алкід, твая дзяціна,
Твая адзіная радзіна,
Любоў адзіная твая,
Гніе ў няволі, ў кайданах.
А ты, гаротная, не знаеш,
Дзе ён канае, прападае.
Ідзеш шукаць яго ў Сібір,
Ці як там... Скіфію... І ты...
І ці адна ты…
<…>

Няма сям'і і няма хаткі,
Няма ні брата, ні сястры,
Каб з горам цяжкім не хадзілі,
Не катаваліся ў турме
Або ў далёкай старане… [2, с. 373]

Яркая палітычная сатыра, палымянае патрыятычнае слова былі немагчымымі ва ўмовах сталінскай дыктатуры, а напісанае Шаўчэнкам у царскія часы нібы і не тычылася сучаснасці, і разам з тым гучала, на вялікі жаль, надзвычай актуальна.

Павага да нашага класіка з боку ўкраінскіх сяброў выяўлялася не толькі ўвагаю да яго творчасці, але і да асобы самога паэта. Так, ва ўкраінскім друку ў розныя гады змяшчаліся віншаванні і матэрыялы пра беларускага песняра з нагоды юбілеяў: Кузьмич В. Якуб Колас: (З нагоди 20-річного юбілею літ. діяльності) // Плужанин. 1926. № 12; Мороз Я. Якуб Колас: (До тридцятиріччя літ. діяльності) // Літ. критика. 1936. № 9.

Блізка ўспрынялі браты-ўкраінцы і самотную падзею – смерць нашага класіка: Нехода І. Якуба Коласа любила Україна: [Верш] // Полымя. 1956. № 9; Пам’яти Якуба Коласа // Звено. 1956. № 2/3. Паказальна, што водгук прагучаў нават з-за акіяна, ад украінцаў-эмігрантаў з Таронта: Помер Якуб Колас // Нові Дні (Торонто). 1956. № 9; Клішевіч У. Пам’яті Якуба Коласа // Нові Дні (Торонто). 1956. № 9.

Матэрыялы, у якіх асвятляліся асабістыя кантакты Якуба Коласа з украінскімі творцамі, альбо дзе разглядаліся пытанні ўплываў і ўзаемаўплываў, аналізаваліся пераклады, пачалі з’яўляцца ў друку ўжо пасля смерці паэта – з канца 50-х гадоў ХХ ст. Гэта былі даклады на канферэнцыях, артыкулы ў перыядычных выданнях, раздзелы ў манаграфіях. Вялікі ўклад у распрацоўку дадзенай тэмы зрабілі Ахрыменка П. (Фальклорна-літаратурныя сувязі ўкраінскага і беларускага народаў. Мн., 1959; Колас і Украіна – Вітчизна /Кіеў/ 1962 № 11; Тарас Шаўчэнка і Беларусь. Мн., 1969), Жыгоцкі М. (Жыватворчыя сувязі: Да 85-годдзя з дня нар. Я. Коласа – Червоний прапор, Харкаў, 1967, 3 ліст.; Украіна помніць нашых песняроў // ЛіМ. 1971. 19 ліст.), Кабржыцкая Т. (Беларускія песняры на Украіне // Наст. газ. 1972. 14 чэрв., Карані дружбы. Мн., 1976 – апошняя ў суаўтарстве з Рагойшам В.), Рагойша В. (Пераклаў Якуб Колас... Мінск, выд. БДУ, 1972), Рыльскі М. (Слово о друге // Рыльский М. Литература и народ. М., 1959.) і інш. Менавіта гэты напрамак, поруч з даследаваннем сучасных перакладаў твораў Якуба Коласа на ўкраінскую мову, не страціў сваёй актуальнасці да нашых дзён і застаецца найбольш перспектыўным.

**Літаратура**

1. Рагойша, В. Пераклаў Якуб Колас... / В. Рагойша. – Мінск : Выдавецтва БДУ, 1972. – 112 с.
2. Шаўчэнка, Т. Вершы, паэмы / Т. Шаўчэнка; укладанне, каментарыі М. Мартынавай; прадм. К.Р. Хромчанкі. – Мінск : Мастацкая літаратура, 1989. – 462 с.